беларускія каапэратывы, незаконна арыштоўвалі і прасьледавалі беларускіх дзеячоў. Але згодна з законам яны ня маюць ніякага права прасьледаваць каго–колечы за прыналежнасьць да Блёку, існуючага на аснове законаў Польшчы.

Наадварот, *кожнае незаконнае прасьледаваньне, кожны бяспраўны арышт у часе выбарнай агітацыі на карысьць Блёку — гэта ёсьць нарушэньне закону, ёсьць цяжкі праступак, за які раней ці пазьней вінавайцы будуць аддадзены пад суд.* І баяцца пагрозаў, на якія ня скупяцца варожыя нам агітатары — панскія найміты, нам няма патрэбы: гэта толькі пустыя словы.

## Рэзалюцыя прадстаўнікоў павятовых і гмінных беларускіх выбарных камітэтаў Лідзкага выбарнага акругу

Заслухаўшы даклад аб зьезьдзе прадстаўнікоў павятовых і гмінных беларускіх выбарных камітэтаў Навагрудзкага выбарнага акругу, адбыўшагася 27 і 28 верасьня 1922 г.[1] у Баранавічах, зьезд прадстаўнікоў Лідзкага выбарнага акругу, адбыўшагася 3 кастрычніка 1922 г. у м. Вільні, пастанавіў:

1) Пратэставаць проці выступленьняў пп. Булак–Балаховічаў, Паўлюкевічаў, Дзергачоў—Адамовічаў, Зямкевічаў і так званых „беспартыйных актывістаў“, якія сваімі выступленьнямі на беларускіх зьездах уносяць разлад у беларускія сплачоныя рады і тым самым памагаюць польскай чорнай сотні ў барацьбе зь беларускім народам.

2) Патрэбаваць ад польскай улады, каб надалей у перадвыбарнай агітацыі не ўжываліся дзікія спосабы барацьбы палкамі і рэвальвэрамі з прадстаўнікамі беларускага народу, што мела месца ў Баранавічах 27.IX–22 г.

3) Паступкі вышэйпамянёных паноў паказваюць нам, што пад беларускім штандарам яны робяць правакатарскую працу не на карысьць беларускага народу, а толькі на карысьць польскай чорнай сотні і паноў.

4) Прызваць увесь беларускі народ аб’яднацца каля БЦВК, які зьяўляецца адзіным праўдзівым прадстаўніком і абаронцам нашых правоў і інтарэсаў.

Старшыня Зьезду *А. Луцкевіч.*
Сакратар *Я. Гаўрылік.*

## Дзядзька Фалькевіч

Памёр дзядзька Фалькевіч.

Яшчэ аднаго слаўнага рабачая на ніве адраджэньня працоўнага беларускага народу вырвала сьмерць з радоў нашага грамадзянства.

Вырвала ў гарачы перадвыбарны час[1], калі праца дзядзькі Фалькевіча ў яго родным Віленскім павеце была б так важна, так патрэбна.

Ня стала беларуса–селяніна, самага старага і самага глаўнага па сваёй працы сярод нашага сялянства віленскіх аколіц.

Памёр ціха і непрыкметна ў сваіх родных Шастаках. „Чаму не відаць нешта дзядзькі Фалькевіча? — ня раз прыходзіла ў голаў віленскім беларусам астатні час, калі гэтак многа бывае тут нашых людзей з усяе Заходняе Беларусі. — Бывала, ён кожную нядзельку пакажацца сярод нас, каб даведацца аб навінах у справе адраджэньня, пагаманіць, падбадрыць, узяць новы нумар роднай газэткі...“

Аж вось зьяўляецца ў „Беларускім Звоне“ кароткая сумная вестка, што ўжо няма на гэтым сьвеце дзядзькі Фалькевіча[2], што пайшоў ужо гаманіць аб беларускіх справах з Бо-